# 1917

## Голас суседзяў

Пад той час, як вядомыя „палітыкі“ ў нашым Краю за найвышэйшую палітычную мудрасьць лічаць нішчэньне ўсяго беларускага і маячаць[1] „анэксіяй“ Беларусі і Літвы да неіснуючага яшчэ Польскага каралеўства, палякі ў Польшчы пільна прыслухаюцца да таго, што робяць і чаго жадаюць іх суседзі з–за мяжы — беларусы і літвіны. Сьвежым прыкладам гэтага служыць дайшоўшая да нас кніжачка, выпушчаная ў двох выданьнях: Ваеннага Дэпартамэнту Глаўнага Нацыянальнага Камітэту і Славянскай Бібліятэкі. Гэта: *Dr Tad. St. Grabowski. „Białoruś pod rządami Rosji“*[2], або, пад другім загалоўкам: *„Rosyjskie rządy na Białorusi“*[3].

Д–р Грабоўскі прачытаў у 1916 г. у Петракове дзьве лекцыі на тэму: Расея як „пякунка“ славян, і нааднэй зь іх гаварыў аб беларусах і змаганьні нашага народу за сваё адраджэньне. У памянёнай кніжцы і перадрукована гэта лекцыя. Тут апісываецца ўся гісторыя беларускага нацыянальнага руху, апісываецца той страшэнны ўціск, які цярпеў наш народ пад расейскім панаваньнем, апісываюцца навет віны тутэйшых палякаў, каторыя так пільна стараліся навязаць беларусам польскую мову і — у асобе кс. Мацяевіча — прызывалі на помач у гэтай справе... Гасударственую Думу! І на моцы багатага фактычнага матэрыялу, на моцы пазнаньня беларускай новай літаратуры, прэсы і іншых праяваў нацыянальнага жыцьця аўтар дае цікавую характарыстыку беларускага руху, стаўляе яму гараскопы на будучыну.

„Рух гэты, — кажа аўтар на 30 стр., — *мае віды на будучыну* затым, што ад самага пачатку свайго ён *апіраецца на шырокіх масах сельскага народу*... Яго адзначывае вялікае *выразуменьне, талеранцыйнасьць* у адношаньні да ўсялякіх кірункаў і дамаганьняў іншых, суседніх народаў, ...ён адзначываецца незвычайна дасьпелым спакоем і раўнавагай, мяркоўнасьцю і справядлівасьцю пры ўсялякіх сустрэчах з супраціўнікамі з таго ці гэтага боку... Рух гэты — паводле знамянітай ацэнкі яго Адольфам Чэрным, найбольш сумленным чэскім славянафілам, каторага дагэтуль ня можа пературавіць афіцыяльная Расея, — гэта рух наскрозь рэальны, сьвядомы сваей мэты, сьвядома дэмакратычны і паступовы, выплываючый з пераконаньня, што народ беларускі прачнецца і заявіць аб сваіх нацыянальных правох толькі тады, калі паднімецца да вышыні ўразуменьня сваіх чалавечых правоў, калі пасьвятлее, узмацуецца эканамічна, — адным словам, гэта рух XX сталецьця, рух эпохі, каторая даўно ўжо пакінула за сабой рамантызм ды пережыла ўжо і пазытывізм, і сацыялізм“.

Сваю лекцыю–брашуру аўтар заканчывае аддзелам, каторы мае загаловак: „Жыў беларус і будзе жыць!“ Адзначыўшы яшчэ раз тыя этапы, якія ўжо прайшлі беларусы, кіруючыся да свайго адраджэньня, адзначыўшы цэннасьці беларускага руху, аўтар кажа:

„Сьмяротным дыханьнем дзьме сівер з Поўначы на бедны люд беларускі і — ня можа гвалтам замарозіць яго. Народ бароніцца верай і шчытом надзеі, і крывавай, цяжкай працай, і сардэчнай песьні жальбой. Зь верай, зь нязломай надзеяй паўстаець колькімільённая беларуская грамада насупроць таго сівера — быццам чорны бор — і насьмяхаецца над Поўначчу...“

Кніжка ўся адзначываецца сымпатыяй да беларускага народу, але не за яе належыцца аўтару падзяка. Мы дзякуем яму за тое, што, нягледзячы на баламуцтвы тых нашых ворагаў — асабліва беларускіх рэнэгатаў, што брахнёй нягоднай паганяць імя нашага народу ў суседзяў, ён услухаўся ў тое, што гаворać самі беларусы, услухаўся ў біцьцё беларускага сэрца і, дачуўшыся яго, сказаў тое, што пачуў, — сказаў праўду.